УДК 821.161.3-31*Л.Рублеўская

**В. А. Каменюкова**
***Навук. кір. – А. В. Брадзіхіна, канд. філал. навук, дацэнт***

# ФЕНОМЕН ДВАЙНІЦТВА Ў РАМАНЕ Л. РУБЛЕЎСКАЙ «ЗОЛАТА ЗАБЫТЫХ МАГІЛ»

*У артыкуле выяўлены асаблівасці рэалізацыі феномена двайніцтва ў творы Л. Рублеўскай «Золата забытых магіл». Разгледжана жанравая структура «паралельнага рамана», згодна з арыгінальным вызначэннем самой пісьменніцы, прасочаны традыцыі У. Караткевіча ў яе прозе. Актуальнасць абранай тэмы бачыцца ў разглядзе мала вывучанага ў беларускім літаратуразнаўстве аспекту творчасці Л. Рублеўскай.*

Людміла Рублеўская – сучасная беларуская пісьменніца, якая актыўна прапагандуе сваю творчасць шырокаму колу чытачоў, пра што сведчыць яе ўдзел у праекце MOVABOX, арганізаваным кампаніяй Velcom. Мастацкія тэксты аўтаркі валодаюць шэрагам характэрных асаблівасцей. Адной з асноўных прыкмет празаічных твораў Л. Рублеўскай з‘яўляецца зварот да гісторыі беларускага народа, працяг традыцый гістарычнага рамана Уладзіміра Караткевіча. Г. Артамонаў слушна адзначае: «Раскрыццю таемных і забытых старонак мінуўшчыны, што нагадвае аб сабе ў сучасным свеце і аказвае ўздзеянне на блізкую будучыню, ідэі захавання і ўмацавання паважлівых і трапяткіх адносін да культурнай спадчыны, падпарадкаваны сюжэтныя лініі раманаў Л. Рублеўскай» [1]. У большасці раманаў пісьменніцы («Золата забытых магіл», «Скокі смерці», «Сутарэнні Ромула» і інш.) прысутнічае падваенне часавай прасторы, паралельнае разгортванне дзеяння адразу ў розных гістарычных перыядах.

Мэтазгодна адзначыць, што феномен двайніцтва ў літаратуры звычайна заснаваны на бінарнай пазіцыі светаадчування персанажа. Вынікам гэтага з‘яўляецца ўзнікненне ў творы герояў-двайнікоў ці падвоенай рэальнасці. Найбольш цікавымі бачацца выпадкі адначасовага выкарыстання ў межах аднаго мастацкага тэксту і двайнікоў, і паралельных рэальнасцей. Прыкладам такой арганізацыі літаратурнага твора можна назваць раман Л. Рублеўскай «Золата забытых магіл».

Ужо ў падзагалоўку да твора даецца яго жанравае вызначэнне



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– паралельны раман. Літаратуразнавец Дз. Бугаѐў у рэцэнзіі да гэтага твора адзначыў: «Тэорыя літаратуры пакуль што не фіксавала такой [*паралельны раман – К. В.*] раманнай формы. У Рублеўскай гэтая форма атрымалася. У яе паслядоўнае чаргаванне раздзелаў пра сучаснасць з раздзеламі гістарычнымі і праўда стварае двухпланавую раманную структуру са складаным, драматычна напружаным і займальным сюжэтам, з мноствам большых і меншых загадак» [2]. Пад паралельным раманам мы будзем разумець такую раманную форму, для якой абавязковым з'яўляецца аднячасовае разгортванне дзеяння адразу ў некалькіх пунктах гістарычнай прамой, раздзеленых значным прамежкам часу. У рамане «Золата забытых магіл» дзеянне паралельна разгортваецца ў XIX стагоддзі (перыяд паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага) і ў наш час. Мінулае і сучаснае звязвае загадка надмагілля Вінцэся Рашчынскага, а таксама кроўная сувязь Паліны, 28-гадовай настаўніцы беларускай школы, з родам Рашчынскіх. Неабходна адзначыць, што раман «Золата забытых магіл» з'яўляецца дэтэктыўным творам, таму наяўнасць у ім таямніцы натуральная і заканамерная.

Гісторыя, якая пачалася ў другой палове XIX стагоддзя, знаходзіць свой працяг на мяжы тысячагоддзяў. Нягледзячы на даволі значную часавую адлегласць, можна сцвярджаць, што свет мінулага і сучаснага ў рамане за кошт іх паралельнага існавання з'яўляюцца люстранымі адбіткамі адзін аднаго. Так, месца дзеяння не мяняецца, не мяняецца нават матывацыя паводзінаў герояў (адны змагаюцца за гістарычную спадчыну свайго народа, іх апаненты апантана імкнуцца да ўсеагульнага прызнання і матэрыяльнага дабрабыту), інакшы толькі ракурс падачы інфармацыі, што дазваляе па-новаму ацаніць значныя гістарычныя падзеі гэтых эпох. Літаратуразнаўца І. Шаўлякова справядліва адзначае, што «ў ‒гісторыяцэнтрычных‖ раманах Л. Рублеўскай канцэпт міжбыцця рэалізуецца на розных ўзроўнях мастацкай структуры твораў, абумоўліваючы не толькі спецыфіку (сюжэтна-кампазіцыйную і вобразна-выяўленчую) уласна тэксту, але і магчымасць цэлага веера інтэрпрэтацый падтэксту, а таксама вектар ‒выхаду‖ мастацкіх ідэй у сѐнняшні сацыякультурны кантэкст» [3, с. 114].

З пазіцыі вызначэння адметнасцей рэалізацыі феномена двайніцтва выклікае цікавасць увядзенне ў твор гістарычных двайнікоў. Так, асноўныя персанажы адной часавай эпохі маюць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

свае копіі-адбіткі ў другой. У адпаведнасці з гэтым можна вылучыць наступныя пары персанажаў: Паліна – Вальжына, Валянцін Чарапавіцкі – Вінцэсь Рашчынскі, Валянцін Сцяпко – Стась Людвісар, Сымон Пятровіч – Мартын, Дзіна – Хрысціна Людвісар. Адметна, што гісторыя сучасных персанажаў, якія імкнуцца разгадаць таямніцу надмагілля, атрымала свой хэпі-энд. Сведкі і ўдзельнікі паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага такога падарунка не атрымалі: іх лёс склаўся трагічна. У сувязі з гэтым можна меркаваць, што наяўнасць у рамане гістарычных двайнікоў з‘яўляецца сцвярджэннем наступнай пісьменніцкай ідэі: нашчадкі адказныя за дзеянні сваіх продкаў, абавязаныя выправіць усе іх памылкі і запоўніць белыя плямы гісторыі. Варта адзначыць, што пытанні адказнасці бацькоў перад сваімі дзецьмі, а таксама адказнасці дзяцей за ўчынкі сваіх бацькоў з‘яўляюцца аднымі з найважнейшых у рамане
«Золата забытых магіл». Менавіта з гэтымі праблемамі звязана трагедыя роду Рашчынскіх: «Ты неяк пытаўся, чаму нашыя сяляне не адрабляюць паншчыну, а толькі плацяць чынш. Гэта і таму, што я хачу хоць нейкім чынам выкупіць зло, якое яны мелі ад майго бацькі. Гісторыя роду – не толькі ваенныя трафеі ды фамільныя партрэты. Гэта – цяжар, які сумленнага змушае схіліцца перад праўдай, а чэрствага – кінуць праўду пад ногі свайму гонару» [4, с. 19]. З названай праблемай звязана і асабістая трагедыя Паліны.

Поруч з гістарычнымі двайнікамі ў твор уведзены і двайнікі галоўных герояў Вінцэся Рашчынскага і Валянціна Чарапавіцкага, якія дзейнічаюць з імі ў адной часавай прасторы. Двайніком Вінцэся Рашчынскага выступае Стась Людвісар, які бачыў у Вінцэсе не проста старэйшага таварыша, а ідэальнага сябе, імкнуўся наблізіцца да абранага ідэалу. Гэтыя персанажы падобныя найперш у імкненні

даказаць іншым сваю вартасць: «Відаць, у магнацкага сына, гэтак жа як у Вінцэся, была непераадольная патрэба ўвесь час даказваць сваю вартасць сабе самому і іншым. Апошні месяц ѐн нават абстрыг дагледжаныя пазногці» [4, с. 104]. І ўсѐ ж паміж імі велічэзная розніца. Рашчынскі мацнейшы духам, ѐн ведае, дзеля чаго змагаецца, адчувае адказнасць за свае ўчынкі перад самім сабой, перад бацькам, перад сябрамі, перад нашчадкамі, і гэтае адчуванне адказнасці герой не губляе на працягу ўсяго жыцця. Стась Людвісар не мае трывалых унутраных перакананняў і прынцыпаў, якія дапамаглі б яму вызначыцца з каштоўнаснымі



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прыярытэтамі. Ён імкнецца стварыць знешні вобраз, перажывае за тое, як яго ўспрымаюць іншыя, і зусім забывае аб самым галоўным – аб працы над сваім духоўным светам. Такім чынам, у рамане ўздымаецца праблема маральнага выбару чалавека: прысвяціць жыццё задавальненню асабістых патрэб ці служэнню на карысць людзям.

Двайнiком Валянціна Чарапавiцкага выступае Валянцін Сцяпко. Як і ў папярэднім выпадку, гэтыя вобразы збліжае імкненне даказаць сваю вартасць самому сабе (Чарапавіцкі) і ўсім, хто аказваецца побач (Сцяпко). Як і Рашчынскі з Людвісарам, двайнікі з‘яўляюцца сябрамі. Толькі Вінцэсь і Стась, у адрозненне ад скульптараў, не ператвараюцца ў ворагаў. Л. Рублеўская ўздымае праблему зайздрасці. Немагчымасць дасягнення жаданага ўзроўню майстэрства прымушае Валянціна Сцяпко ўзненавідзець свайго сябра за яго талент: «Як я пагарджаў табою, калі ты згадзіўся на маю прапанову рабіць помнікі! І я назіраў, як ты апускаешся, з радасцю… Так, але і з болем» [4, с. 104]. Аўтарка засяроджвае ўвагу на тым, што нават нянавісць не можа забіць павагу да сапраўднага таленту.

Такім чынам, Людміла Рублеўская не толькі працягвае традыцыі гістарычнага рамана Уладзіміра Караткевіча, а і актыўна выкарыстоўвае ўласныя прыёмы, сярод якіх – выкарыстанне ў якасці дамінантнага хранатопу мастацкага тэксту двухсветавасці. Паралелізм часоў у рамане «Золата забытых магіл» абумоўлівае сюжэтна-кампазіцыйную спецыфіку твора, дапамагае акцэнтаваць увагу на праблеме адказнасці нашчадкаў за дзеянні іх продкаў і наадварот.

**Спіс літаратуры**

1 Артамонаў, Г. А. Нацыянальныя асаблівасці развіцця сучаснай масавай літаратуры (на матэрыяле амерыканскай і беларускай прозы) [Электронны рэсурс] / Г. А. Артамонаў. – Рэжым доступу: http://elib.bsu.by/handle/123456789/55104. – Дата доступу: 20.05.2018 г.

2 Бугаёў, Дз. Я. Беларускі дэтэктыў Людмілы Рублеўскай [Электронны рэсурс] / Дз. Я. Бугаёў. – Рэжым доступу: http://lir-book.by/%D0%B1%D0%B5%D0%BB%D0%B0%D1%80%D1%83%D1%81%D0%BA%D1%96-%D0%B4%D1%8D%D1%82%D1%8D%D0%BA%D1%82%D1%8B%D1%9E-%D0%BB%D1%8E%D0%B4%D0%BC%D1%96%D0%BB%D1%8B-%D1%80%D1%83%D0%B1%D0%BB%D0%B5%D1%9E%D1%81%D0%BA/. – Дата доступу: 20.05.2018 г.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

3 Шаўлякова, І. Сутарэнні Альбарутэніі: рэміфалагізацыя беларушчыны ў «гісторыяцэнтрычных» раманах Л. Рублеўскай / І. Шаўлякова // Тэксты. Альманах. – Мінск: Галіяфы, 2012. – №2. – С. 111 – 121.

4 Рублеўская, Л. Пярсцѐнак апошняга імператара: раман, аповесць, апавяданні / Л. Рублеўская. – Мінск: Мастацкая літіратура, 2005. – 279 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ